ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 1 (902) | ЧАЦВЕР, 11 студзеня 1996 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ВЫНІКАЎ СЕСІІ

Зімовая экзаменацыйная сесія стала паўнапраўнай гаспадыняй у нашым універсітэце. Але ёсць на сённяшні момант у яе адна вельмі важная асаблівасць -- яе вынікі істотным чынам будуць уплываць на матэрыяльнае становішча студэнтаў.

Як вядома, з 1-га студзеня бягучага года ў рэспубліцы дзейнічае новае палажэнне аб размеркаванні стыпендыяльнага фонду для студэнтаў. Цяпер прадугледжваюцца тры віды стыпендый: сацыяльныя, вучэбныя і імянныя. І выплачвацца яны будуць у залежнасці ад паспяховасці студэнта і яго адносін да вучобы. Таму многія юнакі і дзяўчаты, якія раней з лянотай і прахалодай да яе ставіліся, павінны зрабіць адпаведныя вынікі. Інакш можна застацца, як кажуць, "на галодным пайку".



**Загадчык кафедры хіміі дацэнт Ю.А.Пралляскоўскі ацаніў на "выдатна" адказ студэнта гр.Б-22 біяфака Максіма Мамаева на экзамене па арганічнай хіміі.**

* * *



**Марына Сітнікава з філалагічнага факультэта выдатна валодае ведамі па курсу "Руская вусная народная творчасць". У гэтым упэўнілася на экзамене па ім ст. выкладчыца кафедры рускай літаратуры Л.Л.Ермакова.**

**Фота У.Чысціка.**

## УДАСТОЕНЫ СТЫПЕНДЫЙ КАБІНЕТА МІНІСТРАЎ

Падведзены вынікі конкурсу аспірантаў другога і трэцяга гадоў навучання з адрывам ад вытворчасці на атрыманне стыпендый Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь, якія былі ўстаноўлены ў канцы 1994 г. у памеры пяці мінімальных зарплат кожная. Конкурсная камісія Міністэрства адукацыі і навукі прысудзіла іх на 1996 год і тром аспірантам нашага універсітэта: Паўлу Астахаву -- з кафедры оптыкі, Інэсе Марозавай -- з кафедры рускай літаратуры і Вадзіму Селькіну з кафедры алгебры і геаметрыі.

## *ВІНШУЕМ!*

***Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства ХАЛЯЎКА Алену Іванаўну (навуковы кіраўнік -- дацэнт У.І.Коваль) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.***

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

На зыходзе снежня адбылося чарговае пасяджэнне Савета універсітэта. Абмеркаваны і зацверджаны тэматычны план навукова-даследчых работ на 1996 год, аб якім далажыў прарэктар па навуковай рабоце прафесар А.М.Сердзюкоў. Ён жа праінфармаваў аб выкананні дзяржаўнай бюджэтнай тэматыкі па праблемах Чарнобыля.

Дэкан завочнага факультэта дацэнт М.Н.Мурашка зрабіў паведамленне аб правядзенні кафедрамі арганізацыйна-метадычнай работы ў дні завочніка.

Па конкурсу на вакантныя пасады абраны прафесарамі: С.Ф.Каморнікаў -- па кафедры алгебры і геаметрыі, В.Р.Пінчук -- па кафедры агульнай фізікі; дацэнтамі: М.І.Багданаў -- па кафедры ЭІ і АСК, М.П.Купрэеў -- па кафедры агульнай фізікі, М.М.Фядосенка -- па кафедры оптыкі.

## *З УЗНАГАРОДАЙ!*

За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Ганаровымі граматамі універсітэта ўзнагароджаны загадчык кафедры хіміі дацэнт ПРАЛЯСКОЎСКІ Юльян Антонавіч і дацэнт кафедры эканамічных тэорый ГАЛЕЕЎ Віктар Пятровіч.

Конкурс

# НА ЛЕПШЫ ТЛУМАЧАЛЬНЫ ТЭКСТ ДА ДЗЯРЖАЎНЫХ СІМВАЛАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Распараджэннем кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 21 снежня 1995 г. зацверджана палажэнне аб конкурсе на лепшы тлумачальны тэкст да Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага флага Рэспублікі Беларусь.

Галоўнай мэтай конкурсу з"яўляецца найбольш поўнае раскрыццё сэнсу і значэння цяперашніх дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь у цэлым, а таксама асобных іх элементаў.

Тлумачальныя тэксты да Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага флага Рэспублікі Беларусь павінны ўтрымліваць падрабязнае тлумачэнне гістарычнага, культурнага і эстэтычнага сэнсу і зместу ўсіх элементаў герба і флага. Гэтыя тэксты не павінны перавышаць у машынапісу аднаго аўтарскага аркуша. Тэкст пазначаецца дэвізам, да якога павінен быць прыкладзены запячатаны канверт з поўнымі дадзенымі пра аўтара. Работы, якія не адпавядаюць мэце конкурсу, аформленыя з парушэннем указаных патрабаванняў, а таксама адпраўленыя пасля 1 мая 1996 г., разглядацца не будуць.

Тэкст можа быць на беларускай або рускай мове.

Для пераможцаў конкурсу ўстанаўліваюцца: дзве першыя прэміі -- у памеры 50 мінімальных заработных плат кожная; дзве другія прэміі -- у памеры 30 мінімальных заработных плат кожная.

Устанаўліваюцца таксама памятныя прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь для заахвочвання аўтараў найбольш арыгінальных работ.

Аўтарскі тэкст пераможцы конкурсу будзе выдадзены ў выглядзе маляўнічай брашуры.

Конкурс праводзіцца да 1 мая 1996 года. Яго вынікі будуць падведзены і аб"яўлены да 12 мая 1996 г.

Матэрыялы на конкурс накіроўваць на адрас:

220016, г.Мінск, вул. К.Маркса, 38, з адзнакай: "На конкурс".

## ДЛЯ НАВУЧАННЯ Ў МАГІСТРАТУРЫ УНІВЕРСІТЭТАЎ ЗША

Як паведаміла газета "Рэспубліка", па ініцыятыве Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі Міністэрства адукацыі і навукі нашай краіны сумесна з амерыканскім саветам (AS-SEIS) аб"явіла конкурс на атрыманне стыпендый для навучання ў магістратуры універсітэтаў Злучаных Штатаў Амерыкі, пачынаючы з восені 1996 года, па спецыяльнасцях "Кіраванне бізнесам" і "Міжнароднае права".

Удзел у конкурсе могуць прыняць нашы суайчыннікі ўзростам да 35 гадоў. Абавязковая ўмова -- веданне англійскай мовы, вышэйшая адукацыя і вопыт работы ў адпаведных галінах.

Шчаслівчыкі па заканчэнні курса навучання абавязаны адпрацаваць тры гады на дабрабыт Беларусі.

## УЗНАГАРОДА -- ЭВМ

"Псіхалагічная падтрымка моладзі ў фарміраванні ўстаноўкі на прадуктыўны жыццёвы шлях у постчарнобыльскай сітуацыі" -- такую навуковую распрацоўку паспяхова завяршыў калектыў кафедры псіхалогіі і падрыхтоўкі да вучобы ў ВНУ нашага універсітэта на чале з яе загадчыкам кандыдатам педагагічных навук А.А.Лытко. На конкурсе Гомельскага аддзялення Беларускага Фонда Сораса гэта даследаванне ўдастоена гранта і каштоўнай узнагароды -- ЭВМ навейшай мадэлі з вялікім аб"ёмам памяці. Цяпер ёсць добрая магчымасць яшчэ больш плённа працягваць даследаванне важнай праблемы. Пры абследаванні жыхароў чарнобыльскай зоны ў гэтую ЭВМ можна закладваць шматлікія паказчыкі, пасля апрацоўкі якіх выдаваць усемагчымыя рэкамендацыі.

## БУДЗЕ РАДЫЯЛАГІЧНАЯ ЛАБАРАТОРЫЯ

Гомельскім гарвыканкомам аб"яўлены чарнобыльскім 1996 год. У апошняй дэкадзе красавіка споўніцца дзесяць гадоў з дня самай жудаснай трагедыі -- аварыі на ЧАЭС. Да гэтай даты прадугледжана правесці шэраг важных мерапрыемстваў. У прыватнасці, на біялагічным факультэце нашага універсітэта вырашана адкрыць радыялагічную лабараторыю.

## СТУДЭНТЫ -- ДЗЕЦЯМ

Па добрай традыцыі студэнты нашага універсітэта напярэдадні Новага года актыўна ўдзельнічаюць у дабрачыннай акцыі "Нашы сэрцы -- хворым дзецям", якая праводзіцца рэспубліканскім Дзіцячым фондам. Разам з дацэнтам Т.П.Гаранінай, якая выкладае этыку і эстэтыку, студэнцкая моладзь наладжвае дабрачынныя ёлкі. Студэнты рыхтуюць навагоднія падарункі для дзяцей са шматдзетных сем"яў, сірот, інвалідаў, каб парадаваць хлопчыкаў і дзяўчынак забаўляльнымі цацкамі, цікавымі кніжкамі, маляўнічымі віншавальнымі паштоўкамі і інш.

Напярэдадні 1996 года ва універсітэце было наладжана сем такіх дабрачынных ёлак. Студэнты эканамічнага, геолага-геаграфічнага і завочнага факультэтаў зрабілі ўсё магчымае для таго, каб стварыць святочны настрой для хлопчыкаў і дзяўчынак з цэнтра рэабілітацыі дзяцей, хворых на цэрэбральны параліч, Журавіцкага дзіцячага дома, тых, да каго не вельмі ласкава паставіўся лёс.



На здымку: студэнты спецыяльнасці "Матэматыка" завочнага факультэта з сабранымі навагоднімі падарункамі.

Фота У.Чысціка.



# АД "ЗЯЛЁНАГА КЛАСА" -- ДА ЭКАЛАГІЧНАГА ДАБРАБЫТУ

"Во всех вас сидит бес разрушения. Вам не жаль ни лесов, ни птиц, ни женщин, ни друг друга", -- вуснамі аднаго з герояў п"есы "Дядя Ваня" выказаў вялікі А.П.Чэхаў наспяваўшую ўжо на рубяжы 19-20 стагоддзяў экалагічную праблему не толькі адносна прыроды, але і ў галіне духоўнага жыцця грамадства.

"Бес разрушения" зрабіў ужо дастаткова (чаго толькі каштуе адна чарнобыльская трагедыя!) і працягвае рабіць сваю справу: мы хутка рухаемся да глабальнай экалагічнай катастрофы. Гэта прымушае задумацца не толькі спецыялістаў-эколагаў, не толькі прыродакарыстальнікаў, але і шырокую грамадскасць, педагогаў. І тым не менш становішча, у прыватнасці, у нашай краіне працягвае пагаршацца з-за спроб вырашыць эканамічныя праблемы за кошт спусташальнага прыродакарыстання, незваротнага парушэння прыродных экалагічных сістэм.

Кардынальнае рашэнне экалагічнай праблемы можа быць дасягнута толькі тады, калі захаванне прыроды будзе ўзведзена ў этычны прынцып, стане духоўнай патрэбай для кожнага чалавека. Зразумела, у гэтым накірунку яшчэ трэба нямала папрацаваць: прадстаіць грандыёзная даследчая і асветніцкая работа.

Асновы жыцця і дабрабыту будучых пакаленняў неабходна закладваць ужо зараз, у нашых дзецях: выхавальніках дзіцячых садкоў, навучэнцах школ, вучылішчаў, студэнтах ВНУ.

Неабходнасць экалагічнага выхавання і адукацыі моладзі найбольш востра адчуваюць менавіта педагогі-эколагі. У гэтай сувязі мы назіраем выбух грамадскай экалагічнай свядомасці. Ужо сфарміраваўся і на поўную сілу дзейнічае моцны рух педагогаў-эколагаў у ЗША і Заходняй Еўропе, Малдове, Казахстане, Расіі, Прыбалтыцы і на Украіне. У Беларусі таксама створаны асацыяцыі, якія займаюцца экалагічнай адукацыяй і выхаваннем. Ёсць такая асацыяцыя і ў нас, у г.Гомелі. Стварыў і ўзначаліў яе дацэнт нашага універсітэта, кандыдат педагагічных навук Г.М.Каропа. Назва яе -- "Зялёны клас" -- адлюстроўвае кола праблем, якімі займаюцца члены гэтай арганізацыі.

"Зялёны клас" яшчэ вельмі малады, але ён ужо актыўна дзейнічае, заяўляе аб сабе. Так, нядаўна Беларуская асацыяцыя "Зялёны клас" арганізавала і правяла ў г.Гомелі пасяджэнне "круглага стала" па праблемах тэорыі і практыкі экалагічнай адукацыі і выхавання моладзі. У яго рабоце прынялі ўдзел выканаўчы дырэктар абласнога аддзялення Беларускага Фонда Сораса Ю.І.Варонежцаў, старшыня Беларускай партыі "зялёных" Н.К.Карташ, прадстаўнік Міжнароднай арганізацыі настаўнікаў пры ААН Дэвід Сцікні, педагогі школ г.Гомеля, выкладчыкі ПТВ, ВНУ, прадстаўнікі дзяржаўных і грамадскіх арганізацый.

З праблемным дакладам, у якім дэталёва быў прааналізаваны стан экалагічнай адукацыі ў рэспубліцы на сённяшні дзень, выступіў Г.М.Каропа. Ён падкрэсліў, што экалагічная адукацыя і выхаванне -- гэта педагагічна мэтанакіраваны працэс фарміравання сістэмы ведаў, перакананняў, поглядаў, маральных якасцей, якія "заклікаты забяспечыць станаўленне і развіццё пачуцця адказнасці асобы да прыроды". Ён расказаў аб цяжкасцях у практыцы экалагізацыі, азнаёміў удзельнікаў "круглага стала" з эколага-выхаваўчай работай "Зялёнага класа", з бліжэйшымі задачамі асацыяцыі. Так, сярод галоўных праблем у экалагізацыі насельніцтва рэспублікі, якія патрабуюць хутчэйшага вырашэння, названы наступныя: недаацэнка грамадствам ролі экалагічнай адукацыі ў вырашэнні экалагічных праблем; адсутнасць адзіных падыходаў і адзінага пункту погляду на мэты і сутнасць экалагічнай адукацыі; няўзгодненасць эколага-выхаваўчай работы дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, школ, ВНУ і інш.; адсутнасць у сучасных школах і ВНУ навукова-абгрунтаваных вучэбных праграм, вучэбна-метадычных дапаможнікаў па экалогіі, якія б адпавядалі неабходным патрабаванням сучаснага міжнароднага ўзроўню; непадрыхтаванасць педагагічных кадраў да эколага-выхаваўчай работы; слабае матэрыяльна-фінансавае забеспячэнне, што не дазваляе набываць неабходнае абсталяванне, арганізоўваць даследчую работу навучэнцаў у навуковых лабараторыях, а таксама прымяняць такія высокаэфектыўныя формы

(Заканчэнне на 4 стар.)

## ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСУ

У нашым універсітэце падведзены вынікі конкурсу на лепшыя падручнік і вучэбна-метадычныя дапаможнікі, выдадзеныя за апошнія пяць гадоў. Першую прэмію журы прысудзіла доктару філалагічных навук, прафесару кафедры беларускай мовы У.В.Анічэнку за вучэбны дапаможнік "Асновы культуры маўлення і стылістыкі".

Двум вучоным прысуджаны другія прэміі. Іх удастоены прафесары загадчык кафедры алгебры і геаметрыі В.С.Манахаў за "Тэксты лекцый па курсу "Алгебра і тэорыя лічбаў" у 3-х частках" і загадчык кафедры геафізікі А.П.Пінчук за вучэбны дапаможнік "Фізіка зямлі".

Трэцімі прэміямі адзначаны выданні "Лабараторны практыкум па ядзернай фізіцы" дацэнта кафедры тэарэтычнай фізікі В.А.Андрэева, "Тэорыі рыначнай эканомікі. Вучэбны дапаможнік па курсу "Эканамічныя тэорыі" загадчыка кафедры эканамічных тэорый дацэнта М.В.Герасімчыка і "Руска-беларуска-лацінская тэрміналогія і этымалогія раслін паўднёвага ўсходу Беларускага Палесся" загадчыка кафедры батанікі і фізіялогіі раслін прафесара Л.М.Сапегіна.

## ЗААХВОЧАНЫ ПРЭМІЯМІ

За актыўны ўдзел у вучэбна-метадычнай рабоце універсітэта, арганізацыю і правядзенне на факультэтах конкурсу на лепшыя падручнік і вучэбна-метадычныя дапаможнікі, выпушчаныя ва універсітэцкім і іншых выдавецтвах, за актыўны ўдзел ва ўказаным агульнауніверсітэцкім конкурсе заахвочаны грашовымі прэміямі старшыні метадычных саветаў факультэтаў: біялагічнага -- Л.М.Сапегін, эканамічнага -- Л.С.Лазучэнкава, гісторыка-юрыдычнага -- А.А.Цітова, філалагічнага -- В.А.Ляшчынская, фізічнай культуры -- У.М.Старчанка, геолага-геаграфічнага -- Л.Д.Мядзведзеў, фізічнага -- У.М.Шолах, матэматычнага -- С.Ф.Каморнікаў. Прэміяй таксама адзначана плённая праца сакратара навукова-метадычнага Савета універсітэта В.І.Старакожавай.

# АД "ЗЯЛЁНАГА КЛАСА" -- ДА ЭКАЛАГІЧНАГА ДАБРАБЫТУ

(Заканчэнне. Пачатак на 3 стар.)

экалагічнай адукацыі, як палявыя практыкумы, летнія экалагічныя лагеры, паходы-экспедыцыі па даследаванню і ахове прыроды і г.д.

Разам з тым асацыяцыя не прэтэндуе (і не можа прэтэндаваць!) на вырашэнне ўсіх названых праблем толькі сваімі ўласнымі сіламі, таму "Зялёны клас" імкнецца аб"яднаць сваю работу з дзейнасцю розных сацыяльных структур для сумесных дзеянняў.

Асацыяцыя, аднак, не абмяжоўваецца пастаноўкай праблем, а рэальна дзейнічае. Так, на базе СШ №№ 29, 34, 56, нашага універсітэта члены "Зялёнага класа" распрацоўваюць і апрабіруюць вучэбныя праграмы па экалогіі, рыхтуюць да друку вучэбна-метадычныя дапаможнікі і метадычныя рэкамендацыі, абагульняюць і прапагандуюць вопыт вядучых настаўнікаў-эколагаў г.Гомеля і вобласці.

Адной з найбольш важных задач, якія стаяць перад "Зялёным класам", Г.М.Каропа лічыць стварэнне ў г.Гомелі міжнароднага Цэнтра экалагічнай адукацыі, які будзе выконваць наступныя функцыі: распрацоўваць вучэбныя праграмы і метадычныя рэкамендацыі па экалогіі; фарміраваць, абагульняць і прапагандаваць перадавы вопыт настаўнікаў-эколагаў; арганізоўваць і праводзіць семінары, канферэнцыі, экалагічныя лагеры; тыражыраваць і распаўсюджваць экалагічную літаратуру і г.д.

Свой погляд на ўсе абмяркоўваемыя за "круглым сталом" праблемы ёсць у выкладчыкаў літаратуры. Так, у нашым універсітэце "Зялёны клас" праводзіць эксперымент па распрацоўцы мадэляў экалагічнай адукацыі і выхавання моладзі сродкамі літаратуры. Практычна ўся сістэма народнай адукацыі накіравана на рэалізацыю рацыянальна-практычных (спажывецкіх) ведаў, у той час як працэсу фарміравання духоўна-маральных аспектаў не ўдзяляецца дастатковай увагі. Аднак менавіта літаратура з яе спецыфічнымі сродкамі мастацкай выразнасці, вобразнасці здольная фарміраваць такія маральныя якасці, як міласэрнасць, гуманізм. Таму, лічыць аўтар артыкула, літаратуру як вучэбны прадмет лагічна лічыць адным з асноўных кампанентаў у сістэме экалагічнай адукацыі.

Падводзячы вынікі работы "круглага стала", можна канстатаваць такі факт, што ўсе ўдзельнікі дыскусіі правялі вялікую і сур"ёзную работу, паказалі сваю кампетэнтнасць, адзінства погляду на шляху вырашэння праблем экалагічнай адукацыі і выхавання як моладзі, так і жыхароў рэспублікі ў цэлым. Паміж асацыяцыяй "Зялёны клас" і шэрагам іншых грамадскіх, дзяржаўных і замежных арганізацый была дасягнута дамоўленасць па распрацоўцы сумесных эколага-адукацыйных праектаў.

Адным з важнейшых вынікаў "круглага стала" з"явілася стварэнне рабочай групы, якая будзе каардынаваць усю эколага-выхаваўчую і адукацыйную дзейнасць розных грамадскіх, дзяржаўных структур і арганізацый у г.Гомелі і вобласці.

**Т.АЎДОНІНА,**
**асістэнт кафедры псіхалогіі і падрыхтоўкі да вучобы ў ВНУ.**

*******************************************

Народныя абрады

## " ОЙ, КАЛЯДАЧКІ, БЛІНЫ-ЛАДАЧКІ..."

Напярэдадні Новага года, 29 снежня, перад студэнтамі філалагічнага факультэта І курса выступіла маладзёжная суполка "Талака".

Спачатку старшыня "Талакі" Сяржук Вінаградаў расказаў, што адна з мэтаў суполкі -- збор, вывучэнне і захаванне фальклору Гомельшчыны. Талакоўцы часам ходзяць у фальклорныя экспедыцыі, а сабраны матэрыял рэалізоўваюць у сваіх выступах і пастаноўках народных святаў і абрадаў.

Адну з гэтых пастановак -- калядную -- гледачы мелі магчымасць убачыць. Выступаючыя былі ў беларускіх народных строях, таму гаспадар і гаспадыня, якія сустракалі калядоўшчыкаў, глядзеліся натуральна. Калядныя персанажы -- каза, мядзведзь, воўк, журавель -- былі ўвасоблены цікава, па-адметнаму і з пачуццём гумару. Асаблівы смех выклікала ў гледачоў вядомая інтэрмедыя "Мацей і доктар".

Вядома, важную частку праграмы займалі калядныя песні. Таксама гледачы пазнаёміліся з адметным беларускім інструментам -- дудою і пабачылі некалькі народных танцаў.

Думаецца, пастаноўка спадабалася, бо студэнты на свае вочы пабачылі тое, пра што чулі на лекцыях па фальклору -- абрад калядавання і калядныя песні, у якіх да таго ж была захавана чысціня народнай мовы.

У вялікай ступені паспрыяла поспеху і дасціпнасць выканаўцаў, вялікая колькасць жартаў.

Хочацца верыць, што гледачы не толькі прыемна правялі час, але і па-сапраўднаму зацікавіліся народнымі звычаямі і абрадамі. Развітваючыся, талакоўцы пакінулі свой адрас -- пр-т Кастрычніка, д.23, пакой 13. Збіраюцца яны кожны чацвер а 19- й гадзіне.

"Талака" таксама запрашае ўсіх, хто не прысутнічаў на імпрэзе, але зацікавіўся дзейнасцю суполкі, бо вывучэнне беларускага фальклору -- не адзіная яе мэта.

**А.СТАРАВОЙТАВА,**
**студэнтка гр. БА-14 філалагічнага факультэта.**

## ЯШЧЭ АДЗІН УЛАДАЛЬНІК СОРАСАЎСКАГА ГРАНТА

Прыбавілася сорасаўскіх стыпендыятаў сярод студэнтаў на біяфаку. Мы паведамлялі ўжо на старонках нашай газеты аб тым, што сорасаўскага гранта ўдостоена пяцікурсніца гэтага факультэта Марына Крэгер, а цяпер гэты гонар выпаў яшчэ аднаму выдатніку вучобы студэнту 2-га курса Алегу Баранаву.

Што і казаць, прыклад, варты пераймання.

**(Наш.кар.)**

* * *

## РЭВІЗІЯ АДУКАЦЫІ

"Мы не будзем знішчаць усю платную адукацыю, -- запэўніў свой народ Прэзідэнт Беларусі, -- але падвергнем яе вельмі жорсткай рэвізіі". Правесці рэвізію ўсіх камерцыйных ВНУ рэспублікі Аляксандр Лукашэнка даручыў міністру адукацыі і навукі Васілю Стражаву. Да гэтага Прэзідэнцкая служба кантролю паўгода вывучала становішча спраў у платных навучальных установах і знайшла розныя парушэнні.

**("Аргументы и факты" за 1 студзеня 1996 г.).**



# НА АЛІМПІЯДУ ПАЕДУЦЬ МАЦНЕЙШЫЯ

Кожны дзень набліжае нас да важнейшых спаборніцтваў чатырохгадовага цыкла -- чарговых летніх Алімпійскіх гульняў, якія адбудуцца сёлета ў амерыканскім горадзе Атланце. Упершыню самастойнай камандай прымуць у іх удзел спартсмены Беларусі. Будуць сярод іх і студэнты нашага універсітэта. Пра гэта яны ва ўвесь голас заявілі сваімі паспяховымі выступленнямі. Мінулы 1995 год для іх быў выключна плённым. 8 выхаванцаў ГДУ выканалі нарматывы майстроў спорту міжнароднага класа Рэспублікі Беларусь і 11 -- майстроў спорту. Такога "ураджайнага" не было ні аднаго года ў гісторыі універсітэта.

Высокія дасягненні дазваляюць памерацца сіламі з мацнейшымі спартсменамі планеты. Першай атрымала ліцэнзію для ўдзелу ў Алімпіядзе сярэбраны прызёр мінулагодняга першынства свету па сучаснаму пяцібор"ю Жана Шубянок. Гонар нашай краіны на ёй будуць абараняць таксама семіборка Наталля Сазановіч, Алена Бычкоўская, якая спецыялізуецца ў бегу на сярэднія дыстанцыі, і Таццяна Гулевіч (скачкі ў вышыню). Вельмі блізкія да атрымання запаветных пуцёвак на Алімпіяду весляры на байдарках і каноэ Мікалай Хільман і Сяргей Вераксіч.

Акрамя пералічаных спартсменаў у зборную каманду Беларусі для паездкі на Алімпіяду прэтэндуе яшчэ 10 студэнтаў універсітэта. У гэтым -- паказчык не толькі іх асабістага майстэрства, але і мэтанакіраванай, напружанай працы іх настаўнікаў.

Пра ўсё гэта ішла размова пры



падвядзенні вынікаў спартыўнага 1995 года. На сустрэчы мацнейшых спартсменаў і лепшых трэнераў цёпла вітаў дэкан факультэта фізічнай культуры дацэнт, заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь Б.М.Зайцаў. Пра спартыўныя дасягненні мінулага года расказаў дырэктар спартклуба кандыдат педагагічных навук У.С.Лемяшкоў. 55 спартсменаў і трэнераў удастоены грамат, прэмій і каштоўных падарункаў, якія ўручыў узнагароджаным прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце М.М.Воінаў і пажадаў ім новых поспехаў на спартыўных арэнах.

Лепшым спартсменам універсітэта за 1995 год прызнаны студэнт факультэта фізічнай культуры майстар спорту ў бегу на 800 і 1500 метраў, чэмпіён леташняга зімовага і летняга першынства Беларусі і чэмпіён зімовага першынства Расіі ў бегу на 1500-метровай дыстанцыі Анатоль Будкоўскі. Ганаровага звання лепшага трэнера ўдастоіўся загадчык кафедры аздараўленчай і лячэбнай фізічнай культуры кандыдат педагагічных навук Г.І.Нарскін.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

**На здымку: М.М.Воінаў уручае ўзнагароду майстру спорту А.Будкоўскаму.**

**Фота У.Чысціка.**

ПРА ГОРАД, У ЯКІМ ЖЫВЕМ

# ДА ВЫТОКАЎ ЛЕТАПІСНАГА ГОМЕЛЯ

Гомель -- адзін з самых старажытных гарадоў на тэрыторыі Беларусі. Першае ўпамінанне пра яго ў летапісу адносіцца да 1142 г., калі палкі смаленскага князя Расціслава Мсціславіча абрабавалі сёлы вакол Гомія -- гістарычнага папярэдніка сучаснага горада. З летапісаў мы даведваемся, што ў XII ст. Гомель уваходзіў у склад валоданняў Чарнігаўскага княства. Але летапісцы мала цікавіліся гэтым цэнтрам зямлі радзімічаў, якая аказалася ў баку ад бурных палітычных падзей Кіеўскай Русі. А таму гісторыкі, звяртаючыся да пісьмовых дакументаў, на жаль, не могуць скласці якога-небудзь пэўнага ўяўлення аб вытоках старажытнага горада. І тут на дапамогу прыходзіць археалогія.

Мэтанакіраваныя раскопкі ў Гомелі, у якіх пастаянна ўдзельнічаюць студэнты нашага універсітэта, вядуцца з 1986 г. Рэшткі сярэдневяковага гарадзішча размешчаны на месцы парка імя Луначарскага і прылягаючай зоны гарадской забудовы. Даследаванні ажыццяўляюцца там, дзе паўстае пагроза захаванасці старажытнага культурнага пласта -- земляных адкладанняў, якія насычаны рэшткамі жыццядзейнасці нашых продкаў. Летась такая сітуацыя склалася на сядзібе Петрапаўлаўскага сабора, дзе пачаліся будаўнічыя работы па пракладцы падземных камунікацый.

Кіраўніцтва Гомельскай праваслаўнай епархіі, падпарадкоўваючыся літары Закона аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, звярнулася да вучоных яшчэ да пачатку земляных работ. Для вывучэння старажытных напластаванняў быў створаны археалагічны атрад універсітэта пад кіраўніцтвам аўтара гэтых радкоў і выкладчыка кафедры гісторыі Беларусі В.І.Сычова. Удзельнікамі раскопак сталі студэнты-гісторыкі і выпускнікі гомельскіх школ. Даследаванні разгарнуліся на плошчы каля 100 кв.м.

На глыбіні больш 1,5 м экспедыцыя выявіла сляды старажытнага пасялення, якое існавала ў VI-VIII ст.ст. н.э., г.зн. за 400-600 гадоў да першага ўпамінання горада ў летапісу. Яго заснавалі плямёны, якія былі блізкімі па культуры і вераваннях славянскаму аб"яднанню антаў, жыўшаму некалі ва Усходняй Еўропе і ўпамянутаму візантыйскімі гісторыкамі. Ужо ў трэцяй чвэрці І-га тысячагоддзя н.э. на высокім сожскім беразе стаяла абнесеная крапасной сцяной гарадзішча -- месца пражывання племяннай знаці, вакол якога пасяляліся сяляне і рамеснікі. "Пра-Гомель" быў цэнтрам шырокай сельскай акругі, аб"ядноўваў вакол сябе дзесяткі невялікіх пасяленняў, раскіданых па берагах Сожа і яго прытокаў. Старажытны "правобраз" Гомеля падобны на такіх жа гістарычных папярэднікаў буйнейшых цэнтраў славянскага свету -- Кіева, Полацка, Пскова і інш.

Археалагічныя знаходкі (гліняная пасуда, насадкі для верацёнаў, бронзавыя ўпрыгожванні) сведчаць, што жыццё горада працягвалася і ў IX-X ст.ст. Гомель ператвараўся ў буйнейшае пасяленне Ніжняга Пасожжа -- важнейшы абшчынна-племянны цэнтр славян-радзімічаў, у якім канцэнтравалася і пераразмяркоўвалася даніна, якую бралі з акаляючых пасяленняў. Горадам кіравала мясцовая арыстакратыя. Яна трымала ў сваіх руках гандаль багаццямі краю -- пушнінай, мёдам і воскам. Добра абароненая Гомельская крэпасць магла супрацьстаяць набегам варо-

(Заканчэнне на 6 стар.)

# ДА ВЫТОКАЎ ЛЕТАПІСНАГА ГОМЕЛЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 5-стар.)

жых дружын і экспансіі вялікакняжскай кіеўскай улады. Зусім магчыма, што гомельскія воіны прымалі ўдзел у вядомым паходзе 907 года князя Алега Вешчага на сталіцу Візантыі Канстанцінопаль (Царград).

У канцы X ст. радзімічы, разгромленыя вялікім кіеўскім князем Уладзімірам Святаславічам, уваходзяць у склад Кіеўскай Русі. Гомель атрымоўвае новы імпульс развіцця і ператвараецца ў адзін з цэнтраў "акняжвання" былой плямянной тэрыторыі. Сам горад імкліва расце, пашырае свае межы. Тут квітнеюць і разнастайныя промыслы. З другой паловы XI ст. ён уваходзіць у склад Чарнігаўскага княства.

Матэрыялы раскопак паказалі, што росквіт сярэднявяковага горада адносіцца да XII ст. Яго ядром была магутная княжацкая крэпасць (на месцы цяперашняга будынка музея і Палаца школьнікаў). Да яе прылягаў горад, які таксама меў крапасныя збудаванні. Тут знаходзіліся сядзібы феадалаў і радавых гараджан. У ходзе раскопак даследаваны рэшткі жылых, гаспадарчых і вытворчых збудаванняў "летапіснага" перыяду: заснаванні драўляных наземных дамоў, сляды печаў, звязаных з апрацоўкай жалеза і ювелірнай справай. Гараджане не парывалі і з сельскай гаспадаркай: разводзілі жывёлу, вырошчвалі хлеб, перапрацоўвалі ўраджай. Калекцыя знаходак, выкапаная з зямлі, даволі разнастайная. Прадстаўлены ключы, замкі, нажы, спражкі, рыбалавецкія прылады, бронзавыя і шкляныя ўпрыгожванні, каменныя жорны і інш.

Да ліку найбольш цікавых адкрыццяў археолагаў адносяцца кавалкі пляскатых цаглін-плінф XII ст., якія сведчаць аб наяўнасці ў старажытным горадзе каменных манументных збудаванняў. Магчыма, гэта будаўнічы матэрыял першых гомельскіх храмаў (дакументы XVI-XVIII ст.ст. упамінаюць у дадзенай частцы горада цэрквы Ражства Багародзіцы і Троіцкую). Першыя хрысціяне з"явіліся ў Гомелі яшчэ ў X-XI ст.ст., але нават у XIII ст. іх суседзямі былі язычнікі, якія пакланяліся Перуну, Велесу, русалкам і іншым персанажам мясцовага дахрысціянскага пантэона. У рэштках жылога дома XIII ст. экспедыцыя выявіла амулеты язычнікаў -- прасвідраваныя клыкі жывёлін і мініяцюрную копію баявой сякеры, выконваючую функцыю "оберага".

Палітычная гісторыя Гомеля XII ст. амаль невядома вучоным. Маскоўскі даследчык А.К.Зайцаў меркаваў, што ў 1164г. тут узнікае ўласнае ўдзельнае княжацкае праўленне. Менавіта тады чарнігаўскі князь Святаслаў Усеваладавіч накіраваў у падпарадкаванне яму гарады пасаднікаў (намеснікаў), а ў Гомель, як апавядае летапіс, -- свайго сына. Інакш кажучы, у 1164 г. у Гомелі з"явіўся ўласны князь. Нечаканым пацвярджэннем прамых адносінаў чарнігаўскіх князёў да Гомеля з"яўляецца археалагічная знаходка 1995 г. -- свінцовая пячатка князя Святаслава Усеваладавіча з адлюстраваннем Архангела Міхаіла і святога Кірыла. Гэта пячатка некалі была падвешана да нейкага важнага дакумента -- граматы, дасланай са стольнага горада.

Найбольш упартымі і ўдалымі археолагамі былі студэнты II курса А.Хадановіч, А.Каўтуноў, Д.Гусакоў, С.Сакалоўскі, С.Жыхараў, А.Замойскі, С.Майсеня, першакурснік Д.Малікаў, выпускнік вучылішча В.Залатароў, а ўнікальную княжацкую пячатку знайшоў самы ўважлівы ўдзельнік раскопак Ю.Гарошык, які рыхтуецца да паступлення на гістарычнае аддзяленне нашага універсітэта.

Даследаванне калекцыі сярэдневяковых прадметаў, якія папоўнілі археалагічны музей кафедры ўсеагульнай гісторыі, працягваецца. І да гэтай важнай работы актыўна падключаюцца студэнты-гісторыкі. Р.Кабашнікаў і Д.Шкудун ужо распрацавалі музейны стэнд "Гомельскія кафлі XVI-XVIII ст.ст.", які паспяхова абаронены ў якасці курсавой работы. А цяперашнія першакурснікі спадзяюцца на падставе археалагічных знаходак расказаць будучым наведвальнікам музея аб сярэдневяковай матэрыяльнай культуры Гомеля і касцюме жыхаркі Пасожжа X-XII ст.ст. У працэсе карпатлівай навукова-даследчай работы адкрываюцца вытокі летапіснага горада над Сожам.

**А.МАКУШНІКАЎ,**
**дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі, кандыдат гістарычных навук.**

*Пытайце-адказваем*

# ЯК НАБЫЦЬ ДРУГУЮ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

**Многія чытачы нашай газеты цікавяцца, як набыць другую спецыяльнасць пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы.**

**На гэта пытанне мы папрасілі адказаць прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце дацэнта М.М.Воінава.**

-- Для атрымання вышэйшай адукацыі па другой спецыяльнасці (на платнай аснове) неабходна выканаць вучэбны план гэтай спецыяльнасці ў поўным аб"ёме.

Як паведамілі ў Міністэрстве адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, дазваляецца пераналічваць дысцыпліны, якія былі здадзены ў закончанай ВНУ пры ўмове поўнай адпаведнасці праграмных патрабаванняў па гэтых дысцыплінах. У гэтым выпадку Міністэрства рэкамендуе пераналічваць толькі дысцыпліны, па якіх атрыманы добрыя і выдатныя адзнакі.

З улікам пераналічаных дысцыплін кіраўнікі ВНУ вызначаюць, на які курс залічыць асоб, жадаючых атрымаць вышэйшую адукацыю па другой спецыяльнасці.

Пры немагчымасці залічэння на другі і старэйшыя курсы ў сувязі з неадпаведнасцю пройдзеных дысцыплін або праграмных патрабаванняў па гэтых двсцыплінах жадаючыя атрымаць другую спецыяльнасць абавязаны здаваць уступныя экзамены, або праходзіць субясedванне па прадметах, вызначаных навучальнай установай.



Лідэр

# "СКОРПИОНС"

Група гэта ствараласяў тыя далёкія часы, калі многіх яе цяперашніх прыхільнікаў юнага ўзросту яшчэ не было на белым свеце. Справа была ў пачатку 70-х гадоў, калі двое нікому не вядомых музыкантаў Клаус Мейн і Рудольф Шынкер вырашылі стварыць уласную групу. Выконваць яны рашылі традыцыйны хард, пазбаўлены першапачаткова якой-небудзь прывабнасці і арыгінальнасці. Але... жаданне стаць зоркамі сусветнага ўзроўню -- вось мэта, якую паставілі перад сабой музыканты.

Вось як гаворыць аб гэтым Клаус: "Група павінна не толькі добра іграць, але і спяваць свае песні па-англійску. Выбару няма: у року ёсць традыцыі. Яны фарміраваліся дзесяткамі гадоў, ёсць агульныя законы, у тым ліку звязаныя і са структурай мовы. Ну не "кладзецца" нямецкая мова на рок, што тут зробіш?!"

Дэбютны дыск выйшаў у 1972 годзе, але ён як і некалькі наступных, быў, па сутнасці, пошукам "свайго твару" у року. Слава была лакальнай -- не далей Скандынавіі і роднай Германіі. Толькі з прыходам у групу гітарыста Маціаса Джабса і барабаншчыка Германа Рарабелла саўнд пачаў набываць неабходныя жорсткасць і цяжкасць. Вынікам змянення саставу стала запрашэнне з канцэртным турам у Японію, па матывах якога быў запісаны дыск "Токио Тэйпс".

У гэты час Шынкер вырашае злёгку пераарыентаваць музыку, узяўшы за ўзор класічны гук "Лед Зеппелин". Вынік пераўзышоў усе чаканні: на сумесным канцэрце "Скорпионс" і Тэда Н'южэнта ў Кліўлендзе было каля 65 тысяч гледачоў! Ну а наступны дыск групы "Лавдрайв" дасягнуў у Англіі 12-га месца ў спісу "Топ-50". Наступныя за "Лавдрайв" дыскі толькі ўмацоўваюць пазіцыі групы ў іерархіі зорак хард-року.

У 1985 годзе група адпраўляецца ў тур па ўсяму свету, выконваючы песні з апошніх чатырох пласцінак. Двайны канцэртны альбом, які выйшаў у тым жа 1985 годзе, падвёў вынік шматгадоваму гастраляванню, стаўшы лепшай канцэртнай пласцінкай года.

У 1988 годзе "Скорпы..." упершыню прыязджаюць у СССР. Гэта была першая група, якая прыехала да нас на хвалі папулярнасці. (У адрозненні, напрыклад, ад Сюзі Куатра, Білі Джоэла або "Юрэйе Хип", чый "зорны" час ужо прайшоў на Захадзе...).

У 1989 г. "Скорпионс" прыязджае на Міжнародны фестываль свету ў Маскву разам з Озі Озбарнам, Мотлі Кру і Бон Джові. На гэтым фесце дастойнымі канкурэнтамі "Скорпионс" выступіла амерыканская група "Синдерелла", якая паказала, што меладычны творчы дар Тома Кейфера нічым не ўступае Шынкеру і Мейну. Хаця... у кожнай групы "свой твар". Ну а самай знамянальнай падзеяй стаў прыём у снежні 1991 г. "Міхаілам Гарбачовым і яго жонкай валасатых рокераў у праклёпаных скураных куртках і ботах ва ўрадным корпусе №1 у Крамлі, куды яны пратупалі па прыгожых дывановых дарожках", -- пісалі аб "Скорпионс" у "Метал Хаммер". Прэзідэнту былі ўручаны медныя пласты сінгла "Ветер Перемен" і чэк на 50 тысяч марак. Рэклама спрацавала безадмоўна -- гэты прыём быў паказаны на ўвесь свет, акрамя, натуральна, СССР.

Шматлікія перавыданні старых дыскаў у апошні час яшчэ раз пераканаўча даказваюць, што "Скорпионс" -- адна з буйнейшых хард-рокавых зорак на музычным небасхіле.

**П.БЕСЯЦКІ,**
**вядучы рубрыкі "Лідэр".**

Гэта цікава

# ПЯРСЦЁНКІ НА МУЖЧЫНСКАЙ РУЦЭ

Моцная палова роду чалавечага здаўна любіла гэтыя рэчы, якія, здавалася б, павінны служыць упрыгожваннем толькі слабому полу. Аднак прызначэнне пярсцёнкаў значна больш разнастайнае.

Гэта вядомыя са старажытных часоў рэчы магічнага рытуалу і вялікага сакральнага значэння (лепш за ўсё гэтую думку выказаў Д.Р.Р. Толклен у сваёй "Эпопее колец"). Гэта былі і сімвалы ўлады: такія, напрыклад, пярсцёнкі кардыналаў і епіскапаў Рымска-каталіцкай царквы; пярсцёнкі свецкіх гасудароў і племянных правадыроў, радавых старэйшын, а таксама пярсцёнкі, якія носяцца на мезенцы правай рукі главой "сям"і" італьянскай мафіі. Найбольш папулярныя заручальныя пярсцёнкі як сімвал вернасці мужа і жонкі на безімённых -- радзей -- сярэдніх пальцах (левых рук -- у католікаў, правых -- у праваслаўных). Нездарма па традыцыі ўдаўцы маглі насіць два пярсцёнкі: і сваё, і памерлай. Пярсцёнак можа быць памятным знакам, а можа -- і паказчыкам прафесійнага ўзроўню: у нашы дні нашэнне пярсцёнкаў з датай заканчэння навучальнай установы дастаткова папулярнае сярод выпускнікоў прэстыжных універсітэтаў і каледжаў.

У старадаўнія часы і сярэдневяковыі быў вельмі папулярным пярсцёнак-пячатка (сыкгнет). У пярсцёнку мог быць і тайнічок, дзе, напрыклад, хавалі зярнятка яду "на чорны дзень" або маленькую запіску. Пад адкрываючымся камнем-вечкам -- або замест каменя -- здаралася, змяшчаліся партрэты каханых. Такі пярсцёнак з уласным партрэтам падарыў адной са сваіх сяброўак вядомы Казанова. Пярсцёнак мог служыць апазнавальным знакам, а часам і прыладай для забойства, -- напрыклад, калі вуглы яго каменя або трэшчынка ў ім змазваліся ядам, то пры рукапацісканні павернуты ўнутр камень драпаў руку ахвяры, а яд пранікаў праз царапіну ў кроў. Падобнымі дзеяннямі славілася сям"я Горджыа.

Пярсцёнкі на вялікім пальцы правай рукі маглі мець і непасрэдна баявое прызначэнне. Так, нефрытавыя пярсцёнкі захоўвалі пры стральбе пальцы кітайскіх лучнікоў старажытнасці. Баявы пярсцёнак хеўсураў (адно з горных грузінскіх плямёнаў) меў чатыры шыпы-сацэрулі і мог стаць грознай прыладай рукапашнага бою. А вось у чэркесаў у мінулым стагоддзі тоўстыя металічныя пярсцёнкі на вялікіх пальцах правай рукі служылі вельмі практычным сродкам узвядзення куркоў.

Замкі іх крамянёвых ружжаў мелі вельмі тугія спружыны -- і ўзвядзенне курка пальцам было цяжкім, да таго ж механічнае намаганне магло пашкодзіць скуру. Краем жа пярсцёнка было зручна захапіць верхнюю частку (агаловак) курка і, карыстаючыся кальцом як рычагом, лёгка падрыхтаваць зброю да бітвы. Між іншым, некаторыя нашы суайчыннікі падобным чынам выкарыстоўваюць заручальныя пярсцёнкі або модныя пярсцёнкі-пячаткі для ўскрыцця піўных бутэлек пры адсутнасці кансервавага нажа.

Калі ж дададзім да ўсяго вышэйсказанага яшчэ і эстэтычнае прызначэнне гэтых папулярных твораў ювелірнага мастацтва, то стане зусім відавочным агульначалавечы характар традыцыі нашэння пярсцёнкаў, у тым ліку і прадстаўнікамі мужчынскай паловы чалавецтва.

**Я.БРОЎКІН,**
**ст.выкладчык кафедры ўсеагульнай гісторыі.**

• СПОРТ

## СПАРТАКІЯДА ПЕРАСЯГНУЛА ЭКВАТАР

Завяршыліся спаборніцтвы па міні-футболу ў праграме студэнцкай спартакіяды. У падгрупе каманда факультэта фізічнай культуры паслядоўна перайграла футбалістаў эканомфака з лікам 3:1, матфака -- 6:3, філфака -- 8:2, а ў фінале -- геолага-геаграфічнага факультэта -- 8:1, матэматычнага -- 6:3 і фізічнага -- 3:2.

Другім прызёрам стала каманда геолага-геаграфічнага факультэта, якая ў фінале перамагла матэматыкаў з лікам 9:4 і фізікаў -- 5:1. Трэці радок у турнірнай табліцы заняла каманда фізічнага факультэта.

У заключэнне нельга не адзначыць галоўнага суддзю выкладчыка кафедры фізічнага выхавання Андрэя Блажкевіча, які добра арганізаваў і правёў спаборніцтвы па міні-футболу.

* * *

У канцы мінулага года ў залік студэнцкай спартакіяды прайшлі спаборніцтвы па шахматах.

Добра правялі турнір выхаванцы матэматычнага факультэта, якія сталі пераможцамі. На наступных месцах каманды эканамічнага, біялагічнага, гісторыка-юрыдычнага факультэтаў. 5 і 6 месцы падзялілі філфак і факультэт фізічнай культуры, на 7-м -- фізічны. Турнірную табліцу замкнулі шахматысты геолага-геаграфічнага факультэта.

Асобна трэба адзначыць каманду факультэта фізічнай культуры, якая ўпершыню за апошняе дзесяцігоддзе прыняла ўдзел у такіх спаборніцтвах.

На першай дошцы мацнейшым быў Аляксандр Легінаў (матфак), на другой -- Уладзімір Кавалеўскі (эканомфак) і на трэцяй -- Сяргей Гурскі (гісторыка-юрыдычны факультэт).

Сярод дзяўчат на першай дошцы лепшы вынік паказала Вольга Сапоцкая з эканамічнага факультэта, на другой -- Наталля Кіслеўская з матфака.

Словы падзякі за добрую арганізацыю і правядзенне турніру хочацца выказаць нашаму ветэрану, галоўнаму суддзю турніра Аляксандру Аляксеевічу Косцікаву.

Пераможцы і прызёры спаборніцтваў былі ўзнагароджаны граматамі і атрымалі тарты.

**В.МАРЧАНКА**

Вясёлы перапынак

## НА ЭКЗАМЕНЕ

Прафесар задае студэнту адно пытанне за другім. Студэнт упарта маўчыць. Тады прафесар, глыбока ўздыхнуўшы, кажа:

-- Ну, добра, скажыце хаця б, хто адкрыў Амерыку?

Студэнт паціскае плячыма.

-- Калумб! -- раздражнена крычыць прафесар, -- Калумб!

Студэнт устае і ідзе да выхаду.

-- Куды вы? -- пытаецца прафесар.

-- Я думаў, што вы клічаце наступнага.



**Александр КУЗНЕЦОВ**

### *ЗИМНИЙ СОН*

*Миллионы свежих звезд,*
*Светлых, мерзлых неба слез*
*На моей ладони тают,*
*По моей руке стекают*
*Чистой каплей. Вижу я,*
*Что деревья, не тая*
*Красоты своей, расправив*
*Гордо плечи, не оставив*
*Места грусти, убрались*
*В белые меха. Неслись*
*Хлопья снежные, танцуя.*
*Околдованный, стою я.*
*Все быстрее снег кружится.*
*Чудятся в метели лица*
*Мне -- Зимы то лики.*
*Только жаль, дневные блики*
*Вмиг растопят зимний*
*трон!*
*И окончится мой сон...*

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- педагогікі -- дацэнта;

-- усеагульнай гісторыі -- дацэнта;

-- ВМ і праграміравання -- дацэнта;

-- заалогіі і аховы прыроды -- дацэнта;

-- французскай мовы -- выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры псіхалогіі і падрыхтоўкі да вучобы ў ВНУ выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту **УЛАСАВУ** Аляксандру Васільевічу з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **БАЦЬКІ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры палітычнай сацыялогіі выказваюць глыбокае спачуванне асістэнту **СЕНІНАЙ** Валянціне Фёдараўне з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці **БАЦЬКІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул, Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221
Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул.Савецкая, 1.
За няякасны набор, вёрстку і памылкі фабрыка "Палесдрук" адказнасці не нясе.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 18.
Падпісана да друку 10.01.96.